*ў госці, – / Задумалі і жыхары лясныя / Наладзіць навагоднюю / Сустрэчу*” [2, с. 79].

Паэт падкрэсліваў чарадзейную моц ***малітваў***. Так, у адным з вершаў апісваецца, як старая бабка суцішыла грамы і вятры ў вераб’іную ноч малітвай побач з грамнічнай свечкай. У іншым лірычны герой распавядае пра моц матчынай малітвы, “*якая не раз / Вяртала мяне / Нават з-за свету*” [2, с. 137]. Па прынцыпе малітвы дзейнічае і народная замова, што дапамагае простым людзям вырашаць іх праблемы. Так герой, у духу народных замоў, спрабуе выклікаць дождж: “*Пякельная засуха! / Можа, Бог-Дождж, / Я перад табой / Вінаваты найбольш. / Бо часта ў жыцці / На цябе наракаў, / Калі да касцей / Мяне паласаваў. / За што, калі хочаш, / Мяне і карай, / Але шматпакутны / Мой край не кідай. / Вярніся – малю цябе – / І напаі / Засмяглыя дрэвы, / Палі, ручаі. / Ляціце ж ізноўку, / Аблокі, ў свой час / На крылах грымотных / Вясёлак да нас!*” [2, с. 257–258].

На нашу думку, містыцызм у паэзію ўносіцца аўтарамі дзякуючы прыёму *адзіўлення* (па-руску *остранение* – тэрмін Віктара Шклоўскага). Успрыманне свету праз цудоўнасць, вабнасць яго і яго насельнікаў – прыкмета сапраўднага творцы. Праз асэнсаванне таямніцы снабачанняў, бессмяротнасці, вандроўкі ў часе, жыцця пасля смерці, сумеснага адыходу на той свет разам з каханай, цудадзейнай здольнасці вады, казачнага свету Залюстроўя, магчымасцей гараскопу, моцы малітвы і замовы, адухаўлення памятных мясцін, валуноў – праз чары, разлітыя ў рэальнасці, Максім Танк далучаецца да містычнай літаратурнай традыцыі, жанру містычнай лірыкі, чый патэнцыял у наш час яшчэ недастакова вывучаны.

**Спіс літаратуры**

1. **Гніламедаў, У. В**. “Задача літаратуры – даследаваць чалавека…” : [інтэрв’ю] ; зап. М. Мікуліч // “Заставацца сабой…” / У. Гніламедаў; уклад. М. У. Мікуліч. – Мінск : Выд-ва “Чатыры чвэрці”, 2012. – С. 304–340.
2. **Танк, М**. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк ; рэд. тома В. П. Жураўлёў ; падрыхт. тэкстаў і камент.: Т. У. Мархель ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – Т. 6 : Вершы (1983–1995).
3. **У святле астралогіі** : Лёсы беларускіх літаратараў / уклад. М. Кандратаў. – Мінск : Кнігазбор, 2016.

*Шматграннасць творчасці*

Пётр ДАРАШЧОНАК,
кандыдат філалагічных навук

# ПУБЛІЦЫСТЫКА МАКСІМА ТАНКА Ў БАРАЦЬБЕ ЗА НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДЗІНСТВА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА (1931–1939)

УДК: 821.161.3.09”19”(092)Танк М.+94(476)”1931/1939”

Прааналізаваны публіцыстычныя артыкулы М. Танка, прысвечаныя барацьбе народа Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне ад улады Польшчы.

Ключавыя словы: *газета, публіцыстыка, заходнебеларуская паэзія, літаратурны маладняк, кансалідацыя нацыянальных сіл*.

Maxim Tank’s journalistic articles devoted to the struggle of the people of Western Belarus for social and national liberation from the power of Poland are analyzed.

Сёлета спаўняецца 110 гадоў з дня нараджэння Максіма Танка (Яўгена Скурко). Таленту паэта і палымянага публіцыста давялося прайсці суровую загартоўку ва ўмовах напружанай барацьбы жыхароў Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне ад прыгнёту панскай Польшчы ў 20–30-я гг. XX ст.

Яўген Скурко ў 1927 г. уступіў у камсамол і актыўна ўключыўся ў рэвалюцыйную работу. У пачатку 1929 г. паступіў у рускую Віленскую гімназію імя А. Пушкіна, але пасля ўдзелу ў забастоўцы быў адлічаны. Вярнуўся ў родную Пількаўшчыну, дзе правёў вясну і лета, дапамагаў бацькам весці гаспадарку, чытаў кнігі і пісаў вершы.

Пачатак 1930-х гг. для Я. Скурко звязаны з удзелам у падпольнай камсамольскай працы. За выпуск першага нумара беларускага літаратурна-палітычнага “Часопіса для ўсіх”, актыўную падпольную дзейнасць яго арыштавалі 27 красавіка 1932 г. Юнак трапіў у віленскую турму Лукішкі, дзе правёў за кратамі месяц. Друкавацца пачаў у 1932 г. у часопісе “Пралом”, што выдаваў з паэтам Я. Гарохам, змяшчаў вер-

шаваныя творы ў "Часопісе для ўсіх", газетах-аднадзёнках "На пераломе" і "Беларускае жыццё". У аднадзёнцы "Беларускае жыццё" (выдадзена ў Львове) быў змешчаны першы верш "Заштрайкавалі гіганты-коміны", які аўтар падпісаў псеўданімам *Максім Танк*.

Знаходзячыся на нелегальным становішчы, паэт і публіцыст наладжваў рэвалюцыйную дзейнасць на Віленшчыне і Навагрудчыне. Праца на пасадзе інструктара ЦК камсамола Заходняй Беларусі (1932–1933) была звязана з рызыкай для жыцця. Яго некалькі разоў затрымлівалі польскія ўнутраныя органы. Цэлы год – з мая 1933 да мая 1934 г. – прасядзеў у віленскай турме Лукішкі, у канцы 1933 г., падчас зняволення, выдаваў пры падтрымцы палітвязняў рукапісны часопіс "Краты" (выйшла 6 нумароў), дзе змяшчаў уласныя вершы і творы паэтаў П. Пестрака, В. Таўлая і інш. У другой палове 1930-х гг. вёў "Беларускую калонку" ў польскім выданні "Poprostu", загадваў літаратурным аддзелам у газеце "Наша воля", супрацоўнічаў з "Беларускім летапісам", часопісам "Калоссе". Друкаваў вершы, апавяданні, літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя артыкулы. Неўзабаве малады паэт быў зняволены на новы тэрмін – з верасня да снежня 1934 г.

Час, калі М. Танк уступіў у рэвалюцыйную барацьбу, быў перыядам вострага крызісу ў беларускім руху. Як адзначаў беларускі даследчык А. Горны, "арганізацыйны і інтэлектуальны крызіс руху прывёў да страты ім прывабнасці сярод многіх дзеячаў. Менавіта ў гэты перыяд актывісты розных арганізацый адыходзяць ад грамадскай дзейнасці, пачынаючы працэс адаптацыі да польскага грамадства і вырашэння паўсядзённых жыццёвых праблем" [1, с. 80].

Адной з важных падзей у біяграфіі М. Танка стаў яго актыўны ўдзел у выпуску заходнебеларускай газеты "Наша воля" – друкаванага органа КПЗБ. Менавіта тады быў створаны антыфашысцкі Народны фронт, які аб'яднаў барацьбітоў за дэмакратычныя свабоды, за школу на роднай мове і вырашэнне сацыяльна-эканамічных праблем. Апрача М. Танка ў шэрагах Народнага фронту дзейнічалі Міхась Васілёк, Мікола Засім, Алесь Рэдзька (Дубровіч), Анатоль Іверс (Іван Міско), Ніна Тарас, Ганна Новік, Пятрусь Граніт і інш.

Першы нумар "Нашай волі" з падзагалоўкам "Беларускі незалежны двухтыднёвы часопіс" выйшаў 24 снежня 1935 г. Адказным рэдактарам і выдаўцом газеты стаў Вінцэсь Склубоўскі. Самуіл Малько вёў палітыка-публіцыстычны аддзел, Максім Танк – літаратурны [2, с. 153–154]. Газета стала палітычнай і літаратурнай трыбунай для прагрэсіўных пісьменнікаў. У № 1 рэдакцыя звярталася да чытачоў: «Адчуваючы балючую патрэбу беларускай прэсы, група беларускай незалежнай інтэлігенцыі прыступіла да выдання "Нашае волі". Мы верым, што нашыя пачынанні, да якіх мы доўгі час рыхталіся, знойдуць прыхільнае спатканне сярод беларускага грамадзянства… Заклікаючы ўсіх да супрацоўніцтва, хочам верыць, што "НАША ВОЛЯ" з бегам часу стане воляй Беларускага Народу» [3].

Кожны месяц "Наша воля" прыносіла чытачам новыя вершы і празаічныя творы М. Танка. У № 4 (5) былі змешчаны вершы "Два", "Пад вастрожнай сцяной", "Байка пра Кліма", нарыс "Там, дзе вазёры". У наступным № 5 (6) газеты ад 20 сакавіка 1936 г. М. Танк надрукаваў нарыс "Папярак загонаў", верш "Спатканне". У артыкуле "Вечар беларускай паэзіі і песні" змяшчаўся водгук пра творчасць паэта: «Першую і вялікую славу паражыў Максім Танк. Танк заслужыў у поўнасці таго, што ён паражыў у гэты вечар. Максім Танк – гэта вельмі маладая, але сільная творчасцяю індывідуальнасць. Ягоная творчасць вырасла ў вастрогах і, вырваўшыся з турмы, заліла Зах. Беларусь. Творы Танка – гэта лавіна, якая парывае ўсіх, трасе ўсім і ламае ўсё. Танк можа стацца вялікім песняром Беларусі, калі не забудзе аб найважнейшай умове – згушчаць чым найбольш думку на палатне вобразу. Творы Танка "Першы акт" і "Спатканне" – гэта хваля свежага паветра ў беларускай паэзіі» [5]. У наступным нумары аўтар, які падпісаўся крыптанімам С. Г., яшчэ больш узнёсла ахарактарызаваў вершы паэта: "Трэба прызнацца, што найглыбейшае ўражанне зрабіў на мяне Танк. Ягоныя вершы, поўныя глыбокага рэалізму і духовай бадзёрасці, пазваляюць верыць, што пры памысных варунках Танк праз нейкі час стане найвыдатнейшым і найболей папулярным паэтам Беларусі" [6]. Р. Шырма ў публікацыі «Уражанні з "культурнай крытыкі"» падводзіў першыя вынікі ўзыходжання М. Танка да вышынь паэтычнага майстэрства: "…праўдзівы і глыбокі талент найчасцей спатыкае і заслужана прыхільную ацэнку" [7].

Газета "Наша воля" выдавалася з 24 снежня 1935 да 23 жніўня 1936 г., усяго выйшла 13 нумароў. За гэты час на яе старонках былі апублікаваны апавяданне М. Танка "На прадмесьці" (1936, № 3), яго крытычныя артыкулы аб паэзіі М. Машары «"Падарожжа" і "бездарожжа"» (1936, № 6), "Досыць бездарожжа" (1936, № 8). М. Танк пераклаў на беларускую мову знакамітыя творы М. Горкага: "Песня аб Буравесніку" (1936, № 10), "Песня аб Сокале" (1936, № 11). Шырокі рэзананс у чытачоў выклікала публікацыя "На новы шлях" (1936, № 12) М. Тан-

ка пра патрэбу арганізацыі Саюза беларускіх пісьменнікаў. У гэтым жа нумары быў надрукаваны матэрыял “Па Наваградчыне”, напісаны сакавітай беларускай мовай у жанры падарожнага нарыса.

У другой палове 1930-х гг., асабліва ў перыяд згуртавання сіл Народнага фронту, М. Танк у літаратурна-крытычных і публіцыстычных творах актыўна развіваў ідэю кансалідацыі рэвалюцыйных сіл краіны ў барацьбе за шчасце і волю. У артыкулах “Міхась Васілёк” (1936), «Стрэхі за гасцінцам (М. Машара – “З пад стрэх саламяных”)» (1937), “Крыніцы нашай творчасці”, “Літаратурны маладняк і крытыка” (1938) і іншых, апублікаваных у заходнебеларускай перыёдыцы таго часу, ён сцвярджаў прынцыпы праўдзівасці і народнасці, высокай ідэйнасці. М. Танк працаваў у галіне тэарэтычнага асэнсавання актуальных праблем літаратурна-мастацкага працэсу.

Артыкул “Міхась Васілёк”, надрукаваны ў часопісе “Калоссе”, – не толькі аналіз творчасці таленавітага паэта, але і разважанні пра лёс беларусаў, якія гадамі таміліся пад чужой уладай. Асоба М. Васілька – глыбокага лірыка і паэта-адраджэнца – становіцца ў М. Танка выразнікам жыццёвага крэда цэлай плеяды аўтараў, якія займалі перадавыя пазіцыі ў беларускай літаратуры, ішлі да мастацкай праўды шляхам аналізу рэальнага жыцця. Вобразна, з пачуццём гонару за чалавека працы М. Танк пісаў, што за паэтычнымі радкамі М. Васілька мы «*бачым працоўнага беларуса ў руках з сяўнёй, які, дзесь сярод поля, падставіўшы пад вецер шырокія грудзі, прысягае свайму народу, сваёй матцы – Беларусі. Тут чуеш ня толькі бязмежную любоў да сваёй старонкі, людзей, мовы, – тут чуеш волю чалавека, цвёрдую, як сталь нарогу, якім народ арэ цяжкія злітыя потам скібы роднай зямлі… Трэба было шмат мець сілы волі, каб пранясці праз жыццё чыстую веру ў лепшае заўтра, пэўнасць, якая чуецца на працягу ледзь не ўсёй літаратурнай творчасці Васілька. Жыццё паэта было цесна звязана з жыццём лепшых сыноў народу, і на долю іх, так і паэта, няраз клаліся панурыя цені, у вочы часта заглядваў голад: няраз дыхала сцюжа пад рызманы сялянскай сярмягі.*

*Праз гады векавой няволі мазольнымі рукамі народ вынес свой найвялікшы Скарб – сваю мову, песню, і паэт, выйшаўшы з народных радоў, не заламаўся, праз сцюжу, якая вісела над полем, дратаваным “і ўздоўж і папярок”, вынес кіпучыя шчырым пачуццём свае песні*» [8].

У артыкуле пра творчасць Міхася Васілька (сапр. Міхаіл Касцевіч) М. Танк пісаў, што антыбеларуская пазіцыя польскіх улад, арышты і пераслед, задушлівая атмасфера сялянскага жыцця не дазвалялі паэту шырока разгарнуць творчыя крылы, каб з вяршынь мастацкага слова цалкам ахапіць падзеі жыцця, “выліць у песнях зару новых дзён”. М. Танк настойліва заклікаў штурмаваць творчыя вяршыні, асабліва выдзяляючы ў гэтым працэсе вядучую ролю беларускай інтэлігенцыі.

Невялікай нататкай пад загалоўкам “На дапамогу моладзі”, змешчанай у “Беларускім летапісе”, М. Танк працягваў надзённую тэму, узнятую рэдактарам “Нашай волі” В. Склубоўскім у першым нумары выдання. У беларускім руху, асабліва ў вёсцы, прыкметна звужалася колькасць інтэлігенцыі. На гэта ўплывалі розныя фактары – катастрафічнае становішча беларускага школьніцтва, забарона дзейнасці нацыянальных культурна-асветніцкіх арганізацый і пагаршэнне матэрыяльнага стану сялянства. Ранейшыя кадры інтэлігенцыі значна парадзелі, узніклі перашкоды для прытоку новых сіл, большай часткай матэрыяльныя. Рэдка хто пасля пачатковай школы меў магчымасць вучыцца далей, асабліва цяжка было маладым атрымаць закончаную сярэднюю і вышэйшую адукацыю.

Максім Танк адзначаў, што перад грамадствам, нацыянальнымі культурна-авсетніцкімі арганізацыямі стаіць найважнейшая задача: “*…устрымаць гэту паваротную хвалю нашай моладзі з сярэдніх і вышэйшых школ, даць ім магчымасць вучыцца, акрэпнуць, стаць на ногі!.. Гэта не толькі створыць умовы росту кадраў нашай інтэлігенцыі, гэта паслужыць запарукай цяснейшай сувязі інтэлігенцыі з народам, з якога яна выйшла і будзе выходзіць, – з народам, з грамадзянствам, якое сваёй ахвярнасцю дасць ёй умовы больш інтэнсіўнай працы на родных загонах*” [9].

Артыкул «Стрэхі за гасцінцам (М. Машара – “З пад стрэх саламяных”)» М. Танка (Беларускі летапіс, 1937) – не толькі агляд паэтычнай творчасці таленавітага заходнебеларускага паэта, але і своеасаблівы маніфест аўтара, прысвечаны ролі паэтычнага слова ў фарміраванні актыўнай грамадзянскай пазіцыі сялянства на шляху да лепшай будучыні. “*Міхась Машара тыповы паэт вёскі, вёскі, каторая стаіць водаль ад вялікіх гасцінцаў, па якіх ідуць людзі, скрыпяць калёсы абозаў з сялянскай бядой… Куды яны ідуць? І дзе мэта? Не відаць яе з прасёлачных дарог ды з меж… Толькі паэт чуе, што там, куды ідуць людзі, недзе ёсць шчасце, і яны яго здабудуць і здабудуць для ўсіх. Кожная няўдача тых людзей хвалюе паэта, кожны іх адважны крок, калі не парывае за сабой, усё ж пакідае глыбокі след, улівае надзею ў поступ і веру ў тыя далёкія вехі, якія гараць на народных шляхах…*” [10, с. 161].

Максім Танк добра ведаў рэальнае становішча вёскі з яе матэрыяльнымі праблемамі, "тутэйшасцю", адарванасцю ад "*шырокіх гасцінцаў*", але быў цвёрда ўпэўнены ў тым, што працоўны беларус заслугоўвае лепшай долі: «*У зямлі прарастаюць зярняты, нават нягледзячы на халады. Будзіцца патрэба жыцця, і паэт выпроствае плечы, намуляныя вандроўнымі торбамі, так, як і селянін, нягледзячы на неўраджаі з кожнай вясной выходзіць у поле. "Я жыць люблю". Гэта ўжо не адасоблены голас, а голас тых, каму цяжка жыць і хто ведае, што за свае мазалі, як ніхто іншы, мае права да жыцця*» [10, с. 162]. Аналіз лірыкі М. Машары аўтар дапоўніў уласнымі высновамі: у літаратуры адбываецца наплыў новых сіл, ёсць радыкальныя змены на ідэалагічным і мастацкім грунце, пераацэньваюцца старыя каштоўнасці, вядзецца пошук новых формаў.

Размова пра перспектывы развіцця айчыннай паэзіі і прозы атрымала працяг у артыкуле "Крыніцы нашай творчасці" (Беларускі летапіс, 1938). М. Танк разважаў над тым, як старэйшыя прадстаўнікі беларускай літаратуры адлюстроўвалі ў творчасці "*пару нашага рэнесансу*". Крытычна пераглядаючы пэўныя дасягненні заходнебеларускіх аўтараў, ён адзначаў іх слабую сувязь з народнай творчасцю. Менавіта ў выкарыстанні залатых залежаў народнай творчасці з яе багатым матэрыялам вобразаў, метафар, параўнанняў бачыў аўтар артыкула перспектывы "*мастацкай эвалюцыі нашай паэзіі*".

Максім Танк звяртаў увагу на тое, што народная творчасць не стары, закасцянелы прадукт: "*Народная песня творыцца і ў сённяшнія дні, тым больш у нас, у народу ледзь не пазбаўленага сваёй прэсы… народная творчасць далей у нас развіваецца, узбагачваючыся ўсебакова, змяніваючы, у залежнасці ад гістарычных абставін, і сваю тэматыку. І таму падыход да народнай тэматыкі, выкарыстанне яе, – не перарываючы адначасна тых сонечных нітак, якімі гэтая творчасць звязана з мінуўшым і з сённяшнім днём, – і ёсць той праблемай нашай мастацкай літаратуры, без зразумення якой мы будзем таптацца на месцы*" [11, с. 22].

Публіцыст лічыў сур'ёзным прабелам у літаратурным працэсе запознены зварот да этнаграфічных збораў беларускіх песень і казак, пісаў пра неабходнасць больш глыбокага і грунтоўнага пазнання народнай творчасці, яе важнасці і з мастацкага боку. М. Танк адзначаў, што ў "падкалоднай" барацьбе паміж прыхільнікамі даўніны і літаратурным маладняком важна не захапляцца хваробным фабрыкаваннем адарваных ад жыцця метафараў, шаблонаў, кіравацца не сляпым перапісваннем, а творчай перапрацоўкай бясцэнных россыпаў народнай творчасці [11, с. 24].

Артыкул "Літаратурны маладняк і крытыка" (Беларускі летапіс, 1938, № 4–5) быў прысвечаны перспектывам дзейнасці "*беларускага літаратурнага фронту*". Надзённасць гэтага выступлення ў прэсе была прадыктавана тым, што ў літаратурных колах не існавала агульных тэндэнцый у творчасці, а паняцце пра здаровую крытыку адсутнічала не толькі ў большасці тагачаснага грамадства, але і ў асяроддзі інтэлігенцыі.

Аўтар рэзка крытыкаваў паваенных пісьменнікаў, якія аказаліся пасля нашаніўскага перыяду ў літаратурным тупіку. Знаходзячыся на мяшчанскіх пазіцыях ці пад уплывам мяшчанскіх поглядаў, яны былі мала зацікаўлены жыццём народных мас, пры гэтым ахвотна карысталіся кідкімі паняццямі *народ*, *свабода*, *барацьба*, *адраджэнне*. Яны гучна называлі сябе *бунтарныя*, *пралетарскія*, *сялянскія паэты-адраджэнцы*, *футурыстычныя наватары* і г. д. Толькі значна пазней праявілася сапраўднае аблічча "мяшчанскай літаратуры", якая толькі і аказалася здольнай "*раздрабіць суцэльнае, збаналізаваць вялікае; порах, прызначаны для ўзрыву стар'я, спалены быў у цесных пакоях. Атрымаўся феерверк і шум, але не гром і ўзрыў, ад якога маглі б пасыпацца запляснелыя шыбы вакон*" [12, с. 78].

Паваротным момантам у літаратурным працэсе стала з'яўленне новых творчых сіл, што выклікала не толькі ажыўленне, але і выпрацоўку новых падыходаў да пытанняў дня, актывізацыю грамадскага жыцця і мастацтва. Аўтар падкрэсліў, што "*гэта мог даць і даў маладняк, які выйшаў з народу і з народам прайшоў па этапах і твары, не перарываючы з ім жывой сувязі*" Што датычылася крытычных нататак мяшчанскіх паэтаў, то, па перакананні аўтара артыкула, іх творы "*ніколі не будуць мерай грамадскіх думак, мастацкіх вартасцяў беларускай літаратуры ў шырэйшым яе значэнні*" [12, с. 78].

Максім Танк лічыў, што перашкоды, якія стаялі перад маладымі літаратарамі, – часовая з'ява. Для іх пераадолення трэба паставіць на належны ўзровень прэсу, без якой замаруджваўся прыліў новых творчых сіл, і змяніць праблематыку артыкулаў. Замест "*спарахнелага стар'я*" і непатрэбных дыскусій ён прапанаваў крытыкам пісаць пра жывых людзей, вучыць моладзь і самім вучыцца.

У другой палове 1930-х гг. выйшлі зборнікі паэта "На этапах" (1936), "Журавінавы цвет" (1937), паэма "Нарач" (1937), "Пад мачтай" (1938). Яны сталі выдатнай з'явай у заходнебеларускай літаратуры і атрымалі высокую ацэнку не толькі ў беларускай, але і ў прагрэсіўнай

польскай крытыцы. Польскія ўлады канфіскавалі кнігі “На этапах” і “Нарач”. За зборнік “На этапах” М. Танк атрымаў 6 месяцаў турэмнага зняволення.

З-за цэнзурных абмежаванняў і пераследу з боку дэфензівы М. Танк амаль не меў магчымасці адкрыта пісаць у прэсе пра канчатковую мэту рэвалюцыйнай барацьбы заходнебеларускіх патрыятычных сіл – уз’яднанне беларускага народа ў адзінай нацыянальнай дзяржаве. Але думкі паэта і публіцыста, апублікаваныя ў яго дзённікавых запісах пад назвай “Лісткі календара”, сведчылі менавіта пра гэта.

9/V.1935 г. *“У нас літаратуры прыдаецца велізарнейшае значэнне, якога яна ў іншых народаў даўно не мае. Не знаходзячы ў сённяшнім жыцці справядлівасці, народ шукае ў літаратуры адказу на ўсе пытанні, якія яго хвалююць і непакояць. У нас няма розніцы паміж літаратурай і адозвай, літаратурай і забастоўкай, літаратурай і дэманстрацыяй, таму амаль ва ўсіх палітычных працэсах разам з барацьбітамі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне на лаве падсудных знаходзілася і наша заходнебеларуская літаратура”.*

10/IV.1938 г. *«За гады існавання панскай Польшчы вырасла пакаленне, атручанае вялікадзяржаўным, каталіцкім і шавіністычным духам. І яно, апроч “польскай рацыі”, не бачыла нічога. Толькі трагічныя падзеі ў самой Польшчы, у Германіі, у Іспаніі змусілі многіх задумацца і зрабіць пераацэнкі ўсяму, чаму іх вучылі, і больш цвяроза паглядзець на рэчаіснасць, на жыццё. Некаторыя з іх – з палітычных працэсаў і скупых звестак аб пацыфікацыях – упершыню даведаліся, што пад адной страхой з імі, толькі за закратаванымі вокнамі, жывуць мільёны людзей іншых нацыянальнасцей – людзей, пазбаўленых усіх чалавечых правоў».*

21/0I.1939 г. *“Усё больш пераконваюся, што для папулярызацыі таго ці іншага паэта, ці нават цэлай літаратуры, патрэбна адпаведная званіца. Званіца гэтая – дзяржаўнасць і тое месца на зямлі, якое займае народ і яго мова. А наш голас усё яшчэ не вырваўся нават на волю з падвалаў астрожных карцараў. Аб якім рэзанансе нашай творчасці сёння можа быць гаворка!”*

2/VIII.1939 г. *“Ужо другі год у заходнебеларускай літаратуры пануе смерці падобная цішыня. Спынілася барацьба за якасць, за ідэйнасць… Мы нават не заўважылі, як у гэты час пралегла паміж людзьмі граніца недаверу, якую зараз цяжэй перайсці, чым тую, што абведзена калючым дротам, абстаўлена вартавымі вышкамі; і разраслася на несусветнай хлусні і дэмагогіі варожая прапаганда… А за гэты час нарастаюць напластаванні новай хлусні. Як не хапае нам трыбуны, каб усё паставіць на свае месцы, каб, як раней, з намі лічыліся”.*

9/IX.1939 г. *“Мы – песняры народа невялікага, пра які мала хто чуў на свеце, і ў той жа час мы – песняры народа вялікага і такога багатага, які нават не знае ўсіх сваіх дзяцей, усіх сваіх скарбаў…”* [13].

Публіцыстыка Максіма Танка 30-х гг. XX ст. цесна звязана з мужнай і гераічнай барацьбой заходнебеларускага народа за свабоду і незалежнасць ад панскай Польшчы. Нацыянальны вызваленчы рух – жыватворная крыніца яго паэтычнай творчасці, а надзённыя праблемы літаратурнага і грамадска-палітычнага жыцця паэт аналізаваў у публіцыстычных артыкулах, нарысах, нататках. Максім Танк у публікацыях на старонках газет “Наша воля”, “Poprostu”, “Беларускі летапіс”, часопіса “Калоссе” і іншых выданняў, а таксама ў выдатных паэтычных творах 1930-х гг. імкнуўся да ўсебаковага адлюстравання народнага жыцця, раскрыцця талентаў і здольнасцей найлепшых прадстаўнікоў беларускага народа. Праз кансалідацыю ўсіх творчых сіл – празаікаў, паэтаў, публіцыстаў – паэт пракладваў шляхі да стварэння незалежнай беларускай прэсы, скіраванай на будаўніцтва лепшай будучыні ў сваёй нацыянальнай дзяржаве.

### Спіс літаратуры

1. **Горны, А.** Перыядызацыя гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі (1921–1939) / А. Горны // Беларуская думка. – 2020. – № 9. – С. 75–82.

2. **Гісторыя беларускай савецкай літаратуры** : у 2 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1965. – Т. 1 : 1917–1941 гг. – 633 с.

3. **Ад рэдакцыі** // Наша воля. – 1935. – № 1. – 24 снеж.

4. **В. С-і.** Наперад / В. С-і. // Наша воля. – 1935. – № 1. – 24 снеж.

5. **Вечар беларускай паэзіі і песні** // Наша воля. – 1936. – № 5 (6). – 20 сак.

6. **С. Г.** З “вечара беларускай паэзіі і песні” / С. Г. // Наша воля. – 1936. – № 6 (7). – 12 крас.

7. **В-ІЧ.** Уражанні з “культурнай крытыкі” / В-ІЧ. // Наша воля. – 1936. – № 12. – 23 жн.

8. **Танк, М.** Міхась Васілёк / М. Танк // Калоссе. – 1936. – С. 97–99.

9. **Танк, М.** На дапамогу моладзі / М. Танк // Беларускі летапіс. – 1937. – № 9. – С. 203.

10. **Танк, М.** Стрэхі за гасьцінцам (М. Машара – “З пад стрэх саламяных”) / М. Танк // Беларускі летапіс. – 1937. – № 8. – С. 161–164.

11. **Танк, М.** Крыніцы нашай творчасці / М. Танк // Беларускі летапіс. – 1938. – № 2. – С. 22–25.

12. **Танк, М.** Літаратурны маладняк і крытыка / М. Танк // Беларускі летапіс. – 1938. – № 4–5. – С. 77–83.

13. **Танк, М.** Лісткі календара [Электронны рэсурс] / М. Танк. – Рэыжм доступу: rv-blr.com/literature/charter/24412. – Дата доступу: 19.08.2022.